# *У ПРОМНЯХ ДУХОЎНАГА СВЯТЛА*

**2 снежня на базе УА "Гімназія №2" г. Гродна прайшла IV навукова-практычная канферэнцыя "Каложскія адукацыйныя чытанні", якая з'яўляецца этапам вялікага міжнароднага форума.**

Арганізатарамі канферэнцыі з'яўляюцца Гродзенская епархія Беларускай Праваслаўнай Царквы, аддзел адукацыі, спорту і турызму Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.

Гродзенскую епархію на канферэнцыі прадставілі: настаяцель Свята-Пакроўскага кафедральнага сабора протаіерэй Георгій Рой, клірык Свята-Барыса-Глебскай (Каложскай) царквы г. Гродна іерэй Ігар Данільчык і інш.З прывітальным словам да прысутных звярнуліся арганізатары канферэнцыі, сярод якіх дэкан філалагічнага факультэта Лісоўская І.С., дырэктар гімназіі №2 Кісялеўская А.Е.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел выкладчыкі ўніверсітэта, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Мікалаеўна Тарасава, якая выступіла на пленарным паседжанні з дакладам "Асэнсаванне гісторыі Барыса і Глеба ў творчасці беларускіх пісьменнікаў XX ст.", Аліна Эдмундаўна Сабуць, якая кіравала на канферэнцыі секцыяй "Евангельскія прытчы і іх адлюстраванне ў літаратуры і мастацтве", а таксама выступіла з дакладам на тэму "Біблейскае і нацыянальнае ў барадулінскіх перастварэннях "Псалмаў Давідавых".

У чатырох секцыях канферэнцыі прынялі ўдзел выкладчыкі ўніверсітэта, святары, настаўнікі школ г. Гродна, навучэнцы школ і гімназій, студэнты вышэйшых навучальных устаноў.

На канферэнцыі былі арганізаваны дзве тэматычныя выставы "Прыгажосць Божага свету", "Сведкі аб Хрысце". З музычнымі нумарамі выступілі навучэнцы гімназіі №2 і жаночы камерны хор Гродзенскага дзяржаўнага музыкальнага каледжа.

Праца канферэнцыі прайшла ў светлай духоўнай атмасферы.

***Святлана ТАРАСАВА***

***На здымках:*** падчас IV навукова-практычнай канферэнцыі "Каложскія адукацыйныя чытанні".







